**П.Сівурава**, *дацэнт*

# ФЕСТЫВАЛІ ФАЛЬКЛОРУ І ПРАЦЭСЫ МІЖНАРОДНАЙ КУЛЬТУРНАЙ ІНТЭГРАЦЫІ

Святочна-фестывальная дзейнасць гістарычна склалася і дынамічна развіваецца ў нашым грамадстве як сацыяльная з’ява, якая адлюстроўвае найбольш актуальныя ідэі і патрэбнасці грамадства (гуманізму, духоўнасці, грамадскага прагрэсу, эстэтычнага развіцця асобы і соцыуму). Даследчыкі прыходзяць да высновы, што “фестывалізацыя культурнага жыцця грамадства” становіцца адметнай з’явай сучаснасці [7, с. 10], і аддаюць шмат увагі высвятленню прычын такога феномена. У шэрагу прыярытэтных аспектаў даследавання праблемы – менеджмент, маркетынг фестывальнай дзейнасці, асэнсаванне практыкі правядзення міжнародных фестывальных акцый рознай жанравай накіраванасці [1; 6; 8; 9; 14; 17].

На працягу 1997–2007 гг. аўтарам даследаваліся гісторыка-культуралагічны, сацыяльна-педагагічны і тэхналагічны аспекты праблем развіцця фестывальнай дзейнасці ў сферы народнай мастацкай творчасці ў Беларусі [10; 11; 12; 13; 14]. Дадзены артыкул прысвячаецца разгляду фальклорных фестываляў у кантэксце агульнаеўрапейскіх культурных працэсаў і аналізу іх значэння для сістэмы падтрымкі і развіцця традыцыйнай культуры.

Гістарычная рэтраспектыва сведчыць пра тое, што фестывальная актыўнасць у пасляваеннай Еўропе актывізавалася ў перыяд фарміравання агульнаеўрапейскай супольнасці. Барыс Перыль піша: “Большасць з цяпер вядомых і папулярных фестываляў з’явілася ў 1950-я гады ХХ ст. Іх развіццё звязана не толькі з абнаўленнем відаў відовішчных зносін у структуры сучаснай гарадской культуры, але і з глабальнымі палітычнымі зменамі. У гэты час у міжнародных дакументах і ў практычнай палітыцы фарміравалася і сцвярджалася канцэпцыя адзінай еўрапейскай прасторы, у якой кожная краіна, захоўваючы гістарычна складзеныя палітычныя інстытуты, нацыянальную і культурную самабытнасць, з’яўлялася часткай агульнай міждзяржаўнай прасторы. Адначасова з фарміраваннем новага міжнароднага палітычнага парадку гэта прывяло і да складання агульнаеўрапейскай культурнай прасторы, у якой сетка найбуйнейшых міжнародных фестываляў іграла важную

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

інтэграцыйную ролю ў якасці прэстыжнага поля для міжнароднага артыстычнага абмену, дэманстрацыі лепшых дасягненняў нацыянальных культур” [9, с. 24−73 ].

«У перыяд “халоднай” вайны пры дапамозе некаторых фестываляў правяраліся трываласць жалезнай заслоны, ідэалагічная артадаксальнасць і межы талерантнасці. Пасля заканчэння халоднай вайны ў Еўропе адбылося імклівае павелічэнне колькасці фестываляў. З 1989 г. фестывалі сталі важным інструментам у пераадоленні назапашанага недаверу паміж Усходам і Захадам, пашырэнні супрацоўніцтва», – адзначае дырэктар Інстытута тэатра, прафесар тэатральных даследаванняў ва універсітэце Амстэрдама (Нідэрланды), прэзідэнт Еўрапейскага форуму мастацтваў і спадчыны Драган Клаіч [3].

Паказальнікам інтэграцыйных працэсаў у пасляваеннай Еўропе было стварэнне міжнародных арганізацый у сферы культуры і мастацтва. Так, у 1970 г. у г. Канфланз (Францыя) быў заснаваны Міжнародны савет арганізацый фальклорных фестываляў і традыцыйнага мастацтва (CIOFF), які паспяхова дзейнічае да цяперашняга часу. Мэтамі CIOFF з’яўляюцца падтрымка і захаванне культурнай спадчыны, у тым ліку фальклорнай творчасці, развіццё міжнароднага культурнага абмену, удасканаленне ўзроўню правядзення міжнародных фальклорных фестываляў, а таксама ўмацаванне сяброўства паміж народамі свету. Пад патранажам CIOFF праводзіцца каля 250 фестываляў у 70 краінах. Толькі ў Іспаніі па ініцыятыве CIOFF адбываецца да 30 танцавальных фестываляў.

Краіны СНД і Балтыі актыўна ўключаюцца ў дзейнасць міжнародных арганізацый, што садзейнічае міжкультурнай інтэграцыі. Украіна стала членам CIOFF у 1996 г. З гэтага часу ў Луцку праводзіцца Міжнародны фестываль “Палескае лета з фальклорам”, які ўваходзіць у пяцёрку фестываляў, што праходзяць ва Украіне пад эгідай CIOFF. Яго мэта – папулярызацыя ўкраінскага мастацтва, нацыянальнай харэаграфічнай спадчыны, азнаямленне насельніцтва з дасягненнямі сусветнай культуры. Удзел у фестывалі бяруць фальклорныя калектывы, якія прэзентуюць аўтэнтычны, апрацаваны і сучасны фальклор сваіх краін.

З 2004 г. у Кіеве праводзіцца фестываль “Фольклорний дивосвіт”. Мэта фестывалю – ахова і папулярызацыя традыцыйнай культуры ў такіх формах, як танец, музыка, спевы, народныя рамёствы, гульні і забавы, фарміраванне ў падрастаючага

БІБЛІЯТЭКА БГУКІ

пакалення эстэтычнага густу і павагі да традыцыйнай культуры ўкраінскага народу і народаў свету.

Міжнародны фестываль народнага мастацтва і рамёстваў “Садко” штогод праходзіць у Вялікім Ноўгарадзе. Ён вырас з рэгіянальнага фэсту, які традыцыйна арганізоўваўся на наўгародскай зямлі на працягу 25 гадоў. Заслужаны аўтарытэт фестывалю і велізарны вопыт яго правядзення дазволілі атрымаць у 2002 г. статут міжнароднага. З 2004 г. фестываль праводзіцца пад патранажам Камісіі Расійскай Федэрацыі па справах ЮНЕСКА і Камітэта Расійскай Федэрацыі па захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Фестываль знаходзіцца ў полі зроку такіх міжнародных арганізацый, як CIOFF і IOV пры ЮНЕСКА, з мэтай вывучэння арганізацыйна-творчага вопыту, пашырэння складу замежных удзельнікаў. Фестываль “Садко” аб’ядноўвае фальклорныя групы, ансамблі музыкі і танца, майстроў-умельцаў з розных краін: Вялікабрытаніі, Балгарыі, Італіі, Іспаніі, Мексікі, Турцыі, Фінляндыі, краін СНД і Балтыі.

З 1987 г. у адной з трох Балтыйскіх краін – Літве, Латвіі, Эстоніі – пачаргова пры падтрымцы CIOFF праводзіцца Міжнародны фальклорны фестываль “Балтыка”. Ён прэзентуе абрады і звычаі, песні, танцы, інструментальную музыку, а таксама вырабы саматужнай вытворчасці, нацыянальную кухню – усё тое, што з’яўляецца адметнасцю і унікальнасцю кожнай нацыі і паказвае культурную разнастайнасць.

13 ліпеня 2007 г. у сталіцы Эстоніі Таліне адбыўся дваццаты фальклорны фестываль “Балтыка-2007”. У ім бралі ўдзел больш за 2000 захавальнікаў традыцый народнай творчасці з Эстоніі, а таксама госці з Коста-Рыкі, Ірландыі, Італіі, Карэліі, Карэі, Грэцыі, Літвы, Латвіі, Нарвегіі і Беларусі – усяго каля 300 выканаўцаў. Мерапрыемствы фестывалю праводзіліся ў розных раёнах краіны. Арганізатарам фэсту ў Эстоніі стала Нацыянальная рада па фальклоры.

Беларусь уключана ў кантэксты агульнаеўрапейскіх культурных працэсаў не толькі на практычным, але і на тэарэтычным узроўні. Яна мае вопыт плённага міжнароднага супрацоўніцтва па пытаннях нематэрыяльнай спадчыны. У 1997 г. у Мінску адбылася VI Еўрапейская канферэнцыя Міжнароднай арганізацыі па народнай творчасці IOV “Народная культура ва ўмовах сучасных перамен у розных рэгіёнах Еўропы”, на якой актыўна абмяркоўваліся пытанні правядзення міжнародных фальклорных фестываляў і ўдасканален-

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

ня фестывальнай дзейнасці [7, с. 63−64, 67]. Удзельнік гэтай канферэнцыі Тодар Джыджаў з Балгарыі зазначыў, што “жыццё фальклору на сцэне пашырае яго сувязі і ўзаемадзеянне з аматарскай творчасцю, без чаго сучасны фальклорны працэс быў бы зусім анемічным” [7, с. 21]. Даючы ацэнку фестываляў фальклору, ён падкрэсліў: “Іх значэнне не абмяжоўваецца толькі відовішчным бокам – грандыёзнай дэманстрацыяй традыцыйных песень, танцаў, звычаяў, нацыянальных строяў, мастацкіх вырабаў і інш. Праз гэтую форму фальклор прэзентуецца як нацыянальны духоўны капітал, які атрымлівае асабліва высокую каштоўнасць, калі яго разумеюць як важнае звяно шырокай праграмы эстэтычнага выхавання і разам з тым як невычэрпную крыніцу і аснову для развіцця прафесійнага мастацтва” [7, с. 21].

На вялікі жаль, наша краіна не можа пахваліцца паўнапраўным членствам у CIOFF і не можа ўзяць на сябе ініцыятыву і адказнасць за правядзенне міжнародных імпрэз адпаведнага міжнародным стандартам кшталту.

Гісторыю фестывальнага руху ў суверэннай Беларусі склалі рэспубліканскія фестывалі беларускага народнага танца “Беларуская полька” (1993, 1994, 1996, 2000, г. Чачэрск Гомельскай вобл.), рэгіянальны фестываль аўтэнтычнага фальклору Беларускага Падняпроўя (7−9 чэрвеня 1996 г., в. Вяззе Асіповіцкага р-на, г. Магілёў), фестывалі фальклорнага мастацтва “Берагіня” (2000, 2002, 2004, г.п. Акцябрскі Гомельскай вобл.), “Палескі карагод” (1991, 1994, 1997, 2000, 2004, г. Пінск Брэсцкай вобл.), “Пярэзвы” (1992, г. Бабруйск Магілёўскай вобл.). Беларускі фольк-мадэрн прадстаўлены на фестывалі “Таўкачыкі” (2000, 2004, 2006, 2007, г. Мінск) [13, с. 672–677].

Знакавай з’явай у навуковым і культурным жыцці Беларусі быў Першы міжнародны фестываль фальклору ў Беларусі, які адбыўся 15–21 чэрвеня 1994 г. у Пінску і Мінску. Ім была распачата мэтанакіраваная работа па вывучэнні і прапагандзе музычнага фальклору Беларусі. Асноўная ідэя фестывалю – шырокі паказ беларускага фальклору і сцвярджэнне яго як сусветнай мастацкай каштоўнасці. Фальклорнае мастацтва было прадстаўлена аўтэнтычнымі, аматарскімі і прафесійнымі выканаўцамі (гуртамі, калектывамі, ансамблямі, салістамі). Яго арганізатарамі сталі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, упраўленне культуры Брэсцкага аблвыканкама, Беларускі інстытут праблем культуры, Пінскі гарадскі Савет народных дэпутатаў.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

У першую чаргу фестываль меў навуковыя мэты, якія ставіліся і паслядоўна рэалізоўваліся з удзелам групы навуковых кансультантаў. Ён раскрываў асобныя “адгалінаванні” масавай мастацкай творчасці. Упершыню былі распрацаваны крытэрыі для размежавання калектываў аматарскай творчасці і аўтэнтычных фальклорных гуртоў. Праграма фестывалю ўключала дзень аўтэнтычнага фальклору і дзень аматарскай творчасці. На завяршэнне была арганізавана Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Фальклор і сучасная культура”.

У дзень аўтэнтычнага фальклору свае праграмы прадэманстравалі 28 пеўчых і танцавальных гуртоў, а таксама асобныя выканаўцы – спевакі і музыканты – з усіх шасці этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі. Адкрыццё гэтага дня ўяўляла сабой паказ кола традыцыйных свят вясенне-летняга перыяду, якія ў розных рэгіёнах Беларусі. Дзея адбывалася ў гарадскім парку г. Пінска. Цэнтральным рытуалам свята было распальванне купальскага вогнішча. Перад гледачамі разгарнуліся фрагменты абрадаў гукання вясны, юраўскага шэсця да крыжа і ўпрыгожвання яго, шэсця валачобнікаў, упрыгожванне бярозкі і карагод вакол яе падчас Сёмухі, ваджэння “куста”, купальскага абраду з карагодам каля купальскага вогнішча, скокамі праз яго і спальваннем на ачышчальным купальскім агні лялькі-вядзьмаркі, абраду дажынак [2].

За час фестывалю ў Пінску было паказана больш за 80 разнастайных канцэртных праграм на сямі малых і агульнай вялікай пляцоўцы. У дні фестывалю ў Пінску працаваў горад майстроў народнай творчасці, дэманстраваліся выстаўкі дэкаратыўнаприкладнога і выяўленчага мастацтва, народных строяў Брэсцкага Палесся, кнігі па гісторыі, фальклору і этнаграфіі Беларусі. Удзельнікамі фестывалю сталі каля 1300 чалавек з усіх рэгіёнаў Беларусі, мастацкія калектывы з блізкага (Расія, Украіна) і далёкага замежжа (Нідэрланды, Фінляндыя, Польшча).

Гэтай акцыяй было засведчана, што ў Беларусі ў канцы ХХ ст. у жывым бытаванні захаваўся архаічны каляндарна-абрадавы пласт традыцыйнай культуры. Пасля правядзення фестывалю ў навуковай і масавай свядомасці адбыўся пералом у бок прызнання самакаштоўнасці “вясковай” культуры і пачаўся актыўны пошук метадаў яе вывучэння, захавання, дэманстрацыі і забеспячэння пераемнасці. Знаходкі і здабыткі, зробленыя падчас правядзення фестывалю, вызначылі шляхі работы ў дадзеным кірунку на наступныя дзесяцігоддзі. Ён стаў штуршком для доўгатэрміновай

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

даследчыцкай працы па вывучэнні сучаснага стану традыцыйнай мастацкай культуры беларусаў, кіраўніцтва якой узначаліла Т.Б. Варфаламеева. У прэсе адзначалася, што фестываль узняў прэстыж фальклорнага мастацтва ў краіне і за яе межамі [2, с. 176–184].

Як бачна, у ходзе рэалізацыі фестывальных праектаў актуалізуецца навуковы патэнцыял нацыі, скарачаецца шлях укаранення навуковых ідэй у практыку. Закладзеная ў канцэпцыі Першага міжнароднага фестывалю фальклору ідэя дзяржаўнай падтрымкі і аховы аўтэнтычных формаў класічнай фальклорнай культуры вуснага тыпу, якая мае самадастатковую духоўную каштоўнасць, а таксама з’яўляецца асновай для арганізавана-аматарскіх другасных формаў народнай мастацкай творчасці і прафесійнай творчасці, была выведзена на ўзровень укаранення, успрынята практыкамі і атрымала далейшае развіццё ў новых праектах і праграмах.

Беларусі, безумоўна, патрэбна падобная акцыя міжнароднага маштабу, якая б абагуліла наяўныя сістэмныя арганізацыйна-творчыя намаганні па падтрымцы, захаванні і арганізацыі пераемнасці традыцыйнай народнай культуры, сцвярджала імідж нашай краіны на міжнароднай арэне як краіны, што мае значны культурны патэнцыял, дынамічна развіваецца, клапоціцца пра сваю культурную унікальнасць і развівае культурную інтэграцыю ў розных напрамках.

___________

*Белоблоцкий, Н.* Менеджмент музыкальных фестивалей / Н.Белоблоцкий // ART-менеджер. – 2003. – № 2.

2. *Варфаламеева, Т.Б.* Фестываль прайшоў. Няхай жыве фестываль! Роздум пасля падзеі / Т.Б.Варфалаева // Літ. і мастацтва. – 1994. – 12 верасня; Працяг будзе …/ уклад. М.А.Козенка. – Мн.: БелДІПК, 2004. – С. 176–184.

3. *Клаич, Драган.* Будущее фестивальной формулы: быстрое увеличение / Драган Клаич // Экология культуры. – 2002. – № 3.

4. *Козенка, М.А.* Аб выніках рэалізацыі рэспубліканскага эксперыментальнага праекта “Танцавальны фальклор і дзеці” (2001–2003) / М.А.Козенка // Беларуская культура сёння. 2003. Гадавы агляд. – Мн.: БелДІПК, 2003. – С. 218–230.

5. *Козенка, М.А.* Першы міжнародны фестываль фальклору ў Беларусі / М.А.Козенка // Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва: навук.-інфарм. зб. / Нац. б-ка Беларусі. – Мн., 1995. – Вып. 2. – С. 40–49.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

6. *Меньшиков, А.М.* Фестиваль как социокультурный феномен современного театрального процесса: автореф. … канд. искусствоведения. – М., 2004. – 21 с.

7. *Народная* культура ва ўмовах сучасных перамен у розных рэгіёнах Еўропы: матэрыялы VI Еўрап. канф. Міжнар. арганізацыі па народнай творчасці (IOV), Мінск, 23−26 верас. 1997 г. / пад агульн. рэд. А.Я.Міхневіча. – Мн.: БелІПК, 2000. – 108 с.

8. *Основы* кинофестивального менеджмента: учеб. пособие / под ред. Г.А.Поличко. – М.: ГУУ, 2003.

9. *Периль, Б.В.* Фестивальная практика: опыт case-study / Б.В.Периль // Экология культуры: инф. бюллетень. – Архангельск, 2002. – № 3 (28). – С. 24–73.

10. *Сівурава, Л.П.* Сацыяльна-культурная эфектыўнасць фестываляў дзіцячай творчасці / Л.П.Сівурава // Воспитательное пространство внешкольного учреждения: восхождение к будущему: сб. материалов Междунар. науч.-практ. конф. (Минск, 28–29 апр. 2004). – Мн., 2004. – С. 123–126.

11. *Сивурова, Л.П.* Любительское художественное творчество / Л.П.Сивурова // Современная Беларусь: энцикл. справочник: в 3 т. / редкол.: М.В.Мясникович [и др.]. – Мн.: Бел. наука, 2007. – Т. 3: Культура и искусство. – С. 683–729.

12. *Сивурова, Л.П.* Фестивали / Л.П.Сивурова // Минская область: энциклопедия: в 2 т. / редкол.: Л.Ф.Крупец [и др.]. – Мн.: БелЭн, 2007. – Т. 2. – 512 с.

13. *Сівурава, Л.П.* Фестывалі фальклорныя / Л.П.Сівурава // Беларускі фальклор: энцыклапедыя: у 2 т. / рэдкал.: Г.П.Пашкоў [і інш.]. – Мн.: БелЭн, 2006. – Т. 2: Лабараторыя традыцыйнага мастацтва “Яшчур”. – С. 672–677.

14. *Сівурава, Л.П.* Фестывальная дзейнасць у галіне народнай мастацкай творчасці ў Беларусі на мяжы XX–XXI стст. / Л.П.Сівурава // Весн. Бел. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – Мн., 2005. – Вып. 4. – С. 82–86.

15. *Сівурава, Л.П.* Фестывальная дзейнасць як фактар захавання і развіцця культуры ў рэгіёнах Беларусі / Л.П.Сівурава // Повышение роли клубных учреждений в социокультурной жизни регионов: материалы респ. науч.-практ. конф. (Минск, 22–23 ноября 2006 г.). – Мн.: БелГИПК, 2006. – С. 116–123.

16. *Сівурава, Л.П.* Фестываль фальклору як адна з сучасных форм адраджэння і прапаганды народнага мастацтва / Л.П.Сівурава

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

// Культурнае жыццё Беларусі. – Мн.: Нац. б-ка Беларусі, 1996. – С. 13–18.
*17. Фестивальный* менеджмент. Российский и зарубежный опыт / под ред. В.А.Бобкова. – М., 2007.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ